View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE



**УДК 947.6“1921/1939”**

# МОЛАДЗЬ ПОЛАЧЧЫНЫ І ВІЦЕБШЧЫНЫ Ў ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ 1921–1939 гг.

***канд. гіст. навук, дац. В.В. ДАНІЛОВІЧ***
**Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск**

*Даследуецца праблема ўдзелу моладзі ў грамадска-палітычным жыцці Полаччыны і Віцебшчыны 20–30-х гг. XX ст. Сцвярджаецца, што пачатак 1920-х гг. характарызаваўся значным зніжэннем удзелу маладога пакалення ў грамадска-палітычным жыцці рэгіёну. Палітычная актыўнасць усіх сацыяльных груп юнацтва стала расці толькі з сярэдзіны 1924 г. Да канца 1924 г. савецкія ўлады забаранілі ці прымусілі «самараспусціцца» амаль усе моладзевыя некамуністычныя арганізацыі. Доўгі час у большасці моладзі і нават камсамольцаў рэгіёну адсутнічала палітычная пісьменнасць. Толькі ў другой палове 1930-х гг. значна выраслі як удзельная вага камсамола ў грамадска-палітычным жыцці, так і палітычны ўзровень маладога пакалення. Пры гэтым асаблівасцю камсамола Савецкай Беларусі ў 20-я - 30-я гг. XX ст. з'яўлялася наяўнасць у ім ўнутранай апазіцыі (прычым як левага, так і правага толку), звязанай з апазіцыянерамі ў кампартыі.*

Як вядома, моладзь з’яўляецца важнай сацыяльна-дэмаграфічнай групай у структуры любога грамадства і дзяржавы. Менавіта з маладым пакаленнем звязана будучыня любой нацыі. Можна нават канстатаваць, што моладзь – гэта рухавік сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў. У гэтым кантэксце даследаванне гістарычнага вопыту ўдзелу маладога пакалення Полаччыны і Віцебшчыны ў грамадска-палітычным жыцці ў такі складаны і насычаны зменамі час як 1921–1939 гг. прадстаўляе значны інтарэс.

Увогуле пачатак 1920-х гг. характарызаваўся істотным зніжэннем інтэнсіўнасці грамадска-палітычнага жыцця ў Савецкай Беларусі, у тым ліку і ўдзелу ў ім моладзі. Такое становішча цалкам зразумела, бо ў выніку бурлівых рэвалюцыйных і ваенных падзей грамадска-палітычнае жыццё цэлых 5 гадоў проста віравала. Нягледзячы на гэта, удзел юнакоў і дзяўчын у грамадска-палітычным жыцці не спыніўся.

У пачатку 1920-х гг. у Віцебскай губерні меліся беларускія нацыянальныя маладзёжныя групоўкі эсэраўскага толку. Але яны былі невялікімі, уплыву ў гарадах не мелі і разгортвалі сваю дзейнасць пераважна ў вёсках [1, с. 1]. Цікава адзначыць, што камсамол падтрымліваў сувязь з падобнымі арганізацыямі для атрымання інфармацыі аб іх становішчы, але фактычнай барацьбы з імі не вёў [2, л. 6], што можна растлумачыць як сканцэнтраванасцю камсамола на працы ў гарадах, так і ўвогуле малой колькасцю беларусаў у яго складзе ў той час і адпаведнай адсутнасцю імкнення да пашырэння сваёй працы ў асяроддзі беларускіх юнакоў і дзяўчын.

У Віцебску ў пачатку 1920-х гг. дзейнічаў беларускі студэнцкі гурток, які аб’ядноўваў прыхільнікаў беларушчыны з мясцовага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута і Віцебскага інстытута народнай адукацыі. Гурткоўцы дамагаліся, аднак беспаспяхова, стварэння асобнай беларускай секцыі пры Расійскім гісторыка-мастацкім і археалагічным таварыстве, якое мела філіял у Віцебску [3, с. 217–218].

Яўрэі таксама спрабавалі захаваць на камуністычным палітычным полі асобны маладзёжны яўрэйскі сектар. У 1921 г. арганізацыі Яўрэйскага камуністычнага саюза моладзі (ЯКСМ) дзейнічалі і ў Віцебскай губерні. Напрыканцы года зноў назіраўся рост іх уплыву ў асяроддзі яўрэйскай рабочай моладзі. Напрыклад, у Віцебску ЯКСМ былі створаны студэнцкі клуб, таварыства сапраўднай свабоды і шэраг іншых маладзёжных гурткоў. Прычым у Віцебскай губерні шэраг мясцовых арганізацый саюза адкрыта выступалі пад лозунгам барацьбы за яўрэйскую самастойнасць [4, л. 50; 5, л. 1–22; 6, л. 1; 7, л. 6], што сведчыць аб росце нацыяналістычных настрояў сярод яўрэйскіх юнакоў і дзяўчын.

З 1 мая 1922 г. пачаў выдавацца і распаўсюджвацца ў Віцебскай губерні часопіс “Юный еврейский коммунист”, які з’яўляўся органам ЦК яўкамола [8, л. 1].

У 1922 г. III Фарбандсрат ЯКСМ адзначаў аслабленне тэмпаў развіцця саюза, у тым ліку і ў Віцебскай губерні, з-за вынікаў НЭП, адсутнасці ідэйна-выхаваўчай працы, арганізацыйнай раскіданасці (саюз аддаваў перавагу стварэнню сваіх фарбандаў не ў прамысловых цэнтрах, а ў невялікіх гарадах і мястэчках), цяжкіх праследванняў з боку яўсекцый кампартыі і камсамола. ЯКСМ адчуваў недахоп кадраў. Напрыклад, не было фарбандаўцаў-спецыялістаў для кіраўніцтва ваенна-фізкультурнай працай на месцах. Нягледзячы на ўсё гэта, фарбандшколы яўкамола працягвалі весці палітасветную працу [9, л. 4, 9; 10, л. 1–2, 4].

Polotsk SU

Аднак з-за супрацьдзеяння савецкіх улад наладзіць працу ЯКСМ не ўдавалася. Таму III Усерасійская канферэнцыя яўкамола 23 студзеня 1923 г. прыняла рашэнне аб ліквідацыі саюза і ўступленні яго членаў у камсамол [11, л. 1].

Другім напрамкам дзейнасці яўрэйскай моладзі рэгіёна быў удзел у сіяніцкім руху. Цікава адзначыць, што камсамол падтрымліваў сувязь з сіяніцкімі арганізацыямі для атрымання інфармацыі аб іх становішчы, але барацьбы з імі яшчэ не вёў [2, л. 67]. Гэта можна растлумачыць тым, што з аднаго боку, у гэты час сіяністы падкрэслівалі сваю лаяльнасць да савецкай улады і кампартыі, а з другога – сярод тагачасных камсамольцаў большасць складалі яўрэі.

Увогуле ў пачатку 1920-х гг. сіяніцкія юнацкія арганізацыі ў Віцебскай губерні былі невялікімі, уплыву ў гарадах не мелі і разгортвалі сваю дзейнасць пераважна ў мястэчках, дзе сярод яўрэйскіх юнакоў і дзяўчын актыўна дзейнічалі і былі папулярнымі такія сіяніцкія маладзёжныя арганізацыі як Гашомер-Гацаір ці яўрэйскія скаўты (яе мэта – адпраўка ідэалагічна і фізічна падрыхтаваных маладых яўрэяў у Палесціну), Гехалуц (яе мэта – стварэнне сельскагаспадарчых і прафесійна-тэхнічных калектываў з яўрэйскай моладзі для перасялення ў Палесціну і працы ў земляробчых калоніях) і Маккабі (яе мэта – развіццё спорту сярод яўрэйскіх юнакоў і дзяўчын), якая асабліва ўзмацнілася ў 1922 г. [10, л. 2; 12, s. 109–110; 13, л. 19, 28–29; 14, л. 54]. Гэтыя арганізацыі заяўлялі аб сваёй апалітычнасці [15, л. 8–9].

Акрамя таго, у 1921 г. у Віцебску, Оршы і Полацку дзейнічалі арганізацыі Яўрэйскага сацыялістычнага саюза рабочай моладзі “Югенд Паалей-Ціон” (ЯССРМ “ЮПЦ”). Прычым адной з буйнейшых з іх была Віцебская. Але сувязь цэнтральнага кіраўніцтва з мясцовымі арганізацыямі ў Віцебскай губерні была дрэнная. Усерасійская ўстаноўчая канферэнцыя саюза, сярод 32 дэлегатаў якой 12 (38%) прадстаўлялі арганізацыі ЯССРМ “ЮПЦ” у Савецкай Беларусі, у тым ліку з Полаччыны і Віцебшчыны, вызначыла як галоўныя яго задачы здзяйсненне сусветнай пралетарскай рэвалюцыі, будаўніцтва сацыялістычнай гаспадаркі ў савецкіх рэспубліках і ўтварэнне яўрэйскай нацыянальнай аўтаноміі ў Палесціне [7, л. 7, 12; 16, л. 1;17, с. 4–5, 9]. Як бачым, сацыялістычныя ідэі ў дзейнасці ЯССРМ “ЮПЦ” мелі перавагу над сіяніцкімі, а ў структурным плане амаль 40% членаў саюза прыходзілася на Савецкую Беларусь.

У першай палове 1920-х гг., нягледзячы на спад палітычнай актыўнасці моладзі, на Полаччыне і Віцебшчыне даволі часта адзначаліся напады на камсамольскіх актывістаў. Гэта з аднаго боку, сведчыць аб наяўнасці груп насельніцтва, што крайне варожа ставіліся да камуністычнай ідэалогіі, праваднікам якой у грамадскім асяроддзі з’яўляўся камсамол, а з другога боку, – гаворыць аб імкненні апошняга весці актыўную працу.

У Віцебскай губерні вырасла колькасць, ажывілася арганізацыя і дзейнасць рознага роду прыватных юнацкіх спартыўных клубаў і гурткоў, якія мелі нацыянальны характар, а таксама пашыраўся скаўтызм [2, л. 13]. Аднак рашэннем савецкіх улад недзяржаўныя нацыянальныя спартыўныя аб’яднанні былі ліквідаваны.

Камсамольскія арганізацыі Віцебскай губерні вялі агітацыйную і прапагандысцкую дзейнасць у падтрымку дзяржаўнай палітыкі, у тым ліку і праз правядзенне сходаў маладых рабочых, павятовых і валасных канферэнцый сялянскага юнацтва [18, с. 103]. Напрыклад, у 1921 г. яны паспяхова правялі кампанію 1 мая, у ёй прыняло ўдзел шмат моладзі [2, л. 64].

З верасня 1923 г. у Віцебску дзейнічала гарадское бюро пралетарскага студэнцтва, якое з’яўлялася кіруючым органам для студэнтаў горада – членаў прафсаюзаў і падначальвалася Беларускаму бюро пралетарскага студэнцтва (з 1926 г. – Цэнтральнае бюро пралетарскага студэнцтва, з 1 ліпеня 1932 г. яго функцыі былі перададзены Арганізацыйнаму бюро студэнцкіх секцый ЦСПСБ, якое дзейнічала да 1 чэрвеня 1937 г.) у Мінску. Бюро мела сваіх прадстаўнікоў у міжведамаснай камісіі па размеркаванні студэнтаў на працу і практыку, біржы працы, праўленнях і дэканатах ВНУ Віцебска. Студэнцкія прафкамы горада сярод іншага ўдзельнічалі ў абмеркаванні вучэбных планаў, распрацоўцы метадычных матэрыялаў, уплывалі на фарміраванне прыёмных камісій і камплектаванне вышэйшай і сярэдняй школы, размеркаванне студэнтаў на працу і практыку, а таксама былі задзейнічаны ва ўсіх кампаніях, якія праводзіла кампартыя. З 1928 г. бюро актыўна ўдзельнічала ў барацьбе з праявамі ў навучальных установах антыкамуністычнай ідэалогіі, у іх пралетарызацыі і ачышчэнні ад сацыяльна чужых элементаў [19].

Як вядома, кіраўніцтва кампратыі лічыла адной з важнейшых задач палітычна-асветную і агітацыйна-прапагандысцкую працу сярод насельніцтва ў адпаведнасці з палітыкай партыі. Гэта датычылася і юнага пакалення.

Таму адной з асноўных задач, пастаўленых перад камсамолам, была арганізацыя палітычнай асветы ці так званай ліквідацыі палітычнай непісьменнасці юнакоў і дзяўчын (у першую чаргу камсамольцаў). Увогуле Галоўныя палітыка-асветныя камітэты ва ўсёй працы па палітасвеце юнацтва абапіраліся менавіта на камсамольскія структуры [20, с. 3].

У Віцебскай губерні кіраўніцтва палітасветработай сярод маладога пакалення ажыццяўлялі ваенныя, бо адпаведных прадстаўнікоў РКСМ у паветах не было з-за адсутнасці пайкоў і штатаў.

Нягледзячы на гэта, у шэрагу паветаў палітасветпраца вялася актыўна, але ў першую чаргу, з-за зразумелай зацікаўленасці ваенных, яна была накіравана на дапрызыўнікаў. У выніку ліквідацыя палітнепісьменнасці сярод іх мела станоўчую дынаміку [21, л. 24, 28].

Восенню 1923 г. у Віцебскай губерні, як і па ўсёй РСФСР была праведзена праверка палітведаў гарадскіх камсамольцаў, якія ў выніку былі падзелены на 3 катэгорыі: 1) непісьменных, 2) малапісьменных, 3) пісьменных. У залежнасці ад гэтага вызначалася і форма іх навучання. У палітшколах і палітгуртках для 1-й катэгорыі даваліся агульныя веды аб савецкай уладзе і яе законах, кампартыі і камсамоле. У палітгуртках для 2-й катэгорыі вывучаліся асобныя працы У. Леніна і гісторыя кампартыі. Камсамольцы з 3-й катэгорыі навучаліся ў партыйнай сістэме палітасветы. У 1924 г. была распрацавана і адзіная праграма заняткаў у палітгуртках [22, л. 9].

Гэта дазволіла наладзіць сістэматычнае палітнавучанне амаль усіх гарадскіх і часткі вясковых камсамольцаў (з восені 1923 г. пры падтрымцы павятовых камітэтаў кампартыі сталі рэгулярна праводзіцца курсы-з’езды сельскага камсамольскага актыву) [18, с. 147].

Аднак грамадска-палітычная актыўнасць усіх сацыяльных груп маладога пакалення стала расці толькі з сярэдзіны 1924 г.

У 1924 г. святкаванне гадавін ЛКСМБ таксама ахапіла вялікую частку беспартыйных маладых людзей. У Віцебскай і Полацкай акругах адбыліся канферэнцыі беспартыйнай рабоча-сялянскай моладзі, на якіх значная колькасць удзельнікаў заявіла аб жаданні ўступіць у камсамол [23, л. 22, 51].

У гэты час для барацьбы з антыкамуністычным рухам сярод юнацтва выкарыстоўваліся арышты, падпіскі аб неўступленні, адкрытыя палітсуды, выключэнне з прафсаюзаў і г.д. [23, л. 53]. Але ўсе гэтыя мерапрыемствы не давалі вычарпальных вынікаў. Таму да канца 1924 г. савецкія дзяржаўныя структуры забаранілі ці прымусілі “самараспусціцца” амаль усе маладзёжныя некамуністычныя арганізацыі Рэшткі антыкамуністычнай апазіцыі ў асяроддзі юнакоў і дзяўчын сыходзілі ў падполле, якое выкрывалася і ліквідавалася органамі дзяржаўнай бяспекі [3, с. 164–165].

Аднак юнацкі антыкамуністычны рух не спыніўся і нават адзначалася яго ўзмацненне на глебе актыўнасці моладзі і наяўнасці эканамічных праблем. Працягваліся напады на камсамольцаў у Віцебскай акрузе [24, л. 2; 25, л. 25]. Так, у Сенненскім раёне маладыя заможныя сяляне нават стварылі спецыяльную арганізацыю па барацьбе з камсамолам, якая займалася запалохваннем членаў саюза, арганізоўвала з гэтай мэтай бойкі і скандалы на маладзёжных вечарынах [26, с. 1].

У маі 1927 г. у ВКП(б) абвастрылася супрацьстаянне паміж прыхільнікамі І. Сталіна і трацкістамі [27, с. 141]. Не заставаўся ў баку і камсамол. Пры абмеркаванні на сходах актыву ЛКСМБ пастаўленага перад XV з’ездам ВКП(б) у снежні 1927 г. пытання аб выключэнні Л. Троцкага і Р. Зіноўева з кампартыі ў параўнанні з іншымі камсамольскімі арганізацыямі БССР шмат праціўнікаў выключэння налічвалася ў Віцебску. Інфармацыя аб выключэнні Л. Троцкага і Р. Зіноўева з кампартыі была абмеркавана на пленумах Віцебскага і Полацкага акружных камітэтаў (АК) ЛКСМБ і на сходах усіх камсамольскіх ячэяк. Як сведчаць прынятыя рэзалюцыі, большасць камсамольцаў акруг цалкам падтрымалі пастанову ВКП(б) па гэтым пытанні і рэзка асудзілі трацкізм [28, л. 31; 29, л. 1, 8; 30, л. 39, 41].

Акрамя таго, у 1927 г. у латышскіх вёсках Полацкай і Віцебскай акруг ішла актыўная барацьба заможных сялян супраць уплыву ЛКСМБ на юнацтва, за ўмацаванне ў яго свядомасці нацыянальных перакананняў і настрояў (у выніку нават развальваліся піянерскія атрады). Адначасова меліся выпадкі, калі маладое пакаленне заможнага латышскага сялянства імкнулася патрапіць у камсамол і ўзяць кіраўніцтва яго вясковымі ячэйкамі ў свае рукі. Такія праявы не атрымлівалі ў значным шэрагу выпадкаў дастатковага адпору з боку мясцовых арганізацый КП(б)Б і ЛКСМБ [31, л. 1]. Як бачым, заможнае сялянства распачало спробы скарэктаваць працу камсамола ў адпаведнасці са сваімі інтарэсамі, што можна растлумачыць безвыніковасцю адкрытага супрацьстаяння.

Разам з тым, у 1926/1927 навучальным годзе значна ўзрос ахоп камсамольцаў Полаччыны і Віцебшчыны сеткай партасветы ў горадзе і вёсцы (да 11%), некалькі ўзрос палітузровень вясковых камсамольцаў. Палепшыліся склад і падрыхтаванасць гарадскіх прапагандыстаў, а таксама павялічылася колькасць партыйцаў сярод іх (у Віцебску – да 90%). Працавалі камсамольскія школы-перасоўкі, вырасла колькасць палітгурткоў павышанага тыпу, асабліва на вёсцы. Пры палітшколах дзейнічалі газетныя гурткі, а таксама тэматычныя і бягучай палітыкі [32, л. 34; 33, л. 12; 34, л. 101; 35, л. 42; 36, л. 29].

У 1928–1929 гг. сярод яўрэйскай моладзі Полаччыны і Віцебшчыны зноў актывізаваліся сіяністы [37, с. 164]. Адначасова ЛКСМБ ажывіў працу сярод саматужнай моладзі. У прыватнасці ў Віцебску быў скліканы шэраг яе канферэнцый. У выніку, напрыканцы 1929 г. савецкімі ўладамі з дапамогай камсамола былі ліквідаваны арганізаваныя сіяніцкія групы на Полаччыне і Віцебшчыне і іх уплыў на маладых яўрэяў-працоўных, дзякуючы паляпшэнню эканамічнага становішча апошніх [38, л. 97, 99].

У сувязі з масавай калектывізацыяй у 1929–1930 гг. БССР характарызавалася як адзін з рэгіёнаў з найбольш моцнымі антысавецкімі настроямі, бо ў рэспубліцы адбылося 548 масавых антысавецкіх

Polotsk.su

выступленняў, найбольш значную сілу ў якіх складала моладзь, у тым ліку на Полаччыне і Віцебшчыне. Пік гэтых выступленняў прыйшоўся на сакавік – красавік 1930 г. [39, с. 792, 795, 798].

Адначасова ў кампартыі і камсамоле СССР узмацніліся праявы правай апазіцыі [40, с. 74]. У ЛКСМБ быў адзначаны ўздым праяў правага ўхілу як сярод асобных камсамольцаў, так і цэлых ячэяк. Актыўна правыя апазіцыянеры дзейнічалі ў Аршанскай і Полацкай акругах [41, л. 25; 42, л. 5; 43, л. 36, 38, 66; 44, л. 11; 45, л. 1а, 5; 46, л. 82; 47, л. 69; 48, л. 42, 54–55, 58–59, 63; 49, с. 1]. Меліся выпадкі, калі камсамольцы адмаўляліся ад уступлення ў калгасы, збіралі подпісы сялян супраць іх стварэння, патрабавалі пашырыць прыватны гандль [44, л. 12–13]. Прычым правыя апазіцыйныя настроі былі распаўсюджаны не толькі сярод камсамольцаў, але і маладых рабочых [31, л. 1]. Пры гэтым асобныя АК, раённыя камітэты (РК) і ячэйкі камсамола Полаччыны і Віцебшчыны дапускалі сур’ёзныя не толькі правыя, але і левыя перагібы ў працы, а таксама прымірэнства ў адносінах да гэтых з’яў [50, л. 200; 51, л. 1].

Асабліва антысавецкія настроі былі распаўсюджаны сярод студэнцтва. У 1931 г. былі зафіксаваны антысавецкія праявы сярод студэнтаў у Віцебскім індустрыяльна-педагагічным інстытуце і Аршанскім мясным тэхнікуме. Антысавецкія праявы ўключалі: размовы на тэму “банкроцтва пяцігодак” і пераваг капіталістычных метадаў гаспадарання; сцвярджэнні аб правале калектывізацыі і выступленні супраць яе правядзення; кампраметацыю сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, сцвярджэнні аб перавагах аднаасобнага гаспадарання; праявы нявер’я ў рэалізацыю пастановы ЦК ВКП(б) аб паляпшэнні матэрыяльнага становішча настаўніцтва; распальванне незадаволенасці студэнцкай масы; падрыў мерапрыемстваў партыйных і камсамольскіх арганізацый у навучальных установах; траўлю партыйцаў, кампраметацыю іх перад студэнцтвам; агітацыю супраць сацыялістычнага спаборніцтва, удзелу ў суботніках і г.д.; сцвярджэнне, што хутка непазбежная вайна прывядзе да звяржэння ўлады бальшавікоў; прад’яўленне калектыўных патрабаванняў да адміністрацый навучальных устаноў і партарганізацый аб тэрміновым паляпшэнні матэрыяльна-побытавага стану студэнцтва; крытыка ўнутранай і знешняй палітыкі савецкай улады. У Віцебскім індустрыяльна-педагагічным інстытуце і Віцебскім ветэрынарным інстытуце былі таксама зафіксаваны выпадкі агітацыі юнакоў і дзяўчын за нацыянал-дэмакратычныя ўстаноўкі [52, л. 13–19, 165]. Як бачым, спектр незадаволенасці студэнтаў палітыкай савецкай улады быў даволі шырокі.

Пры гэтым праявамі правага ўхілу ў ЛКСМБ лічыліся: асерадняччванне росту і ўцягванне ў саюз толькі ўдарнікаў, замест стопрацэнтнага ахопу рабочага і батрацкага юнацтва [53, л. 38]; няўвязка камсамольскімі арганізацыямі Дубровенскага раёна падрыхтоўкі да веснавой сяўбы з павелічэннем колькасці калгаснікаў [54, л. 67]; спуск шэрагам РК кампаніі сельскагаспадарчых нарыхтовак на самацёк; неарганізацыя шэрагам РК і ячэяк мас камсамольцаў на рашучую барацьбу з класавым ворагам [55, л. 2–3]; недаацэнка палітычнай значнасці мабілізацыі фінансавых сродкаў і развіцця ашчадсправы; стаўка на самацёк у калгасным руху з боку Гарадокскага, Бешанковіцкага, Дубровенскага, Сіроцінскага, Багушэўскага РК; незмаганне са скарачэннем планаў пашырэння пасяўных плошчаў [56, л. 10, 37]; заявы аб немагчымасці выканання мабілізацыі камсамольцаў на дарожнае будаўніцтва і ў свінагадоўчыя саўгасы Дрысенскім РК [57, л. 53; 58, л. 56].

У 1933 г., па меркаванні кіраўніцтва КП(б)Б, камсамольцы Віцебска, асабліва ячэйкі ў навучальных установах, праявілі палітычную недальнабачнасць і недастатковую класавую пільнасць у барацьбе з антысавецкімі праявамі [59, л. 54–55].

Увогуле ў 1933–1934 гг. сярод часткі камсамольцаў і моладзі Полаччыны і Віцебшчыны адзначаліся антысавецкія погляды (галоўным чынам, у вобласці калгаснага будаўніцтва), распаўсюджванне розных правакацыйных чутак і г.д. Асабліва шматлікімі падобныя праявы былі ў асяроддзі камсамольцаў навучальных устаноў і маладых настаўнікаў у Віцебскім, Лепельскім, Лёзненскім раёнах. Асобныя камсамольцы (пераважна выхадцы з заможных сялян) у Лёзненскім раёне сталі на шлях адкрытай барацьбы з савецкай уладай праз актыўную агітацыю, а таксама непасрэдны ўдзел у антысавецкіх арганізацыях і групах [60, л. 77; 61, л. 16, 20–23].

У 1936–1937 гг. у сувязі з фінальнай стадыяй барацьбы за ўладу паміж І. Сталіным і яго праціўнікамі, так званай “падпольнай апазіцыяй” [27, с. 307; 40, с. 13, 15, 206–207], становішча ўнутры камсамола БССР стала крытычным. Праца Асвейскага, Бягомльскага, Дрысенскага, Лёзненскага, Суражскага РК камсамола была ўвогуле развалена. Шэраг ячэяк ЛКСМБ Полаччыны і Віцебшчыны таксама абвінавацілі ў адсутнасці належнай класавай пільнасці і неабходнай барацьбы з антысавецкімі ўплывамі на маладое пакаленне [62, л. 130; 63, л. 93, 105]. Усё вышэйзгаданае яскрава гаворыць аб іх наяўнасці.

Узнялася хваля выкрыцця ў ЛКСМБ ворагаў народа. У многіх камсамольскіх арганізацыях колькасць выключаных перавышала колькасць прынятых. У 1937–1938 гг. актыў саюза амаль поўнасцю абнавіўся за кошт прыхільнікаў палітыкі І. Сталіна, якія атрымалі перамогу.

Гаворачы аб прадстаўніцтве маладога пакалення ў органах улады і кіравання ў разглядаемы перыяд, перш за ўсё неабходна звярнуць увагу на камсамол, які, як вядома, быў створаны ў якасці апоры



Polotsk SU

і сродка распаўсюджвання ўплыву новай бальшавіцкай улады ў маладзёжным асяроддзі. Таму гэтай арганізацыі адводзілася важная роля ў палітычнай сістэме краіны.

Менавіта камсамол павінен быў ісці ў авангардзе прадстаўніцтва моладзі ў органах улады і кіравання, у тым ліку і Савецкай Беларусі. Кампартыя пастаянна імкнулася накіроўваць лепшую частку камсамольцаў на працу ў саветы і дзяржаўны апарат [37, с. 104].

Пацвярджэннем значнай ролі КСМБ у дзяржаўнай структуры з’яўляецца тое, што яшчэ 3 снежня 1923 г. ЦК саюза быў праінфармаваны аб запланаваным узбуйненні тэрыторыі рэспублікі. Цікава адзначыць, што камсамольскае кіраўніцтва Гомельскай вобласці было за аб’яднанне з ССРБ, а Віцебскай вобласці – супраць [64, л. 75, 81].

Увогуле ў 1924 г. узрасла колькасць камсамольцаў у саветах, выканкамах і іншых дзяржаўных органах [65, с. 39–42]. У гэтым годзе камсамол Беларусі прыняў актыўны ўдзел у перавыбарах саветаў (асабліва ў Віцебскай акрузе). Камсамольцы дапамагалі арганізоўваць перадвыбарныя сходы, вылучалі кандыдатаў у дэпутаты, выкрывалі варожыя дзеянні заможных сялян і іх прыхільнікаў [37, с. 135].

Цікава адзначыць, што ў 1926–1927 гг. у БССР па колькасці абраных у сельскія і мястэчковыя саветы камсамольцаў лідзіравалі Віцебскі і Аршанскі раёны (табл. 1.) [66, л. 50].

Табліца 1

**Вынікі ўдзелу ЛКСМБ у перавыбарах сельскіх і мястэчковых саветаў БССР 1926 г. і 1927 г. (выбраныя камсамольцы)**

| Акруга | 1926 г. | 1927 г. |
|---|---|---|
| Магілёў | 180 (8 %) | 174 (7,5 %) |
| Бабруйск | 195 (8,2 %) | 190 (8,3 %) |
| Слуцк | 121 (8,2 %) | 156 (10,4 %) |
| Калініна | 162 (9,04 %) | 200 (11,14 %) |
| Полацк | 134 (8,7 %) | 179 (11,6 %) |
| Мазыр | 97 (6,3 %) | 120 (7,4 %) |
| Мінск | 200 (10,6 %) | 196 (9,75 %) |
| Барысаў | 180 (8,51 %) | 198 (11,31 %) |
| Віцебск | 315 (18 %) | 287 (11,7 %) |
| Орша | 246 (13,3 %) | 277 (14,73 %) |
| Па БССР | 1800 (9,5 %) | 1977 (10,3 %) |
| Гомель | – (3,4 %) | 121 (4,6 %) |
| Рэчыца | – (3,19 %) | 111 (4,7 %) |

Аднак у 1930 г. мабілізацыя 1000 камсамольцаў на пасады сакратароў сельсаветаў, асабліва ў часткі перакідкі мабілізаваных у іншыя раёны ўвесь час знаходзілася пад пагрозай зрыву [50, л. 380]. З гарадскіх ячэяк на сталую працу ў сельсаветы былі мабілізаваны 100 камсамольцаў. З іх па Віцебску – 18, Оршы – 8, Полацку – 7 [67, л. 29].

У 1931 г. перавыбарчая кампанія саветаў БССР прайшла пры надзвычай актыўным удзеле камсамола. У Віцебскім раёне прайшлі канферэнцыі дэмабілізаваных чырвонаармейцаў. У шэрагу раёнаў камсамольскія структуры актыўна дапамагалі ў арганізацыі і самастойна праводзілі сходы жанчын, а таксама дэманстрацыі з нагоды перавыбараў саветаў. У рамках правядзення кампаніі шырока разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва ячэяк розных раёнаў. Амаль ва ўсіх раёнах Полаччыны і Віцебшчыны высылаліся па сельсаветах і вёсках агітбрыгады з раённага камсамольскага актыву і камсамольцаў з вытворчасці. Многія раёны шырока практыкавалі прымацоўванне камсамольцаў да адпаведных населеных пунктаў, за якія яны неслі поўную адказнасць. У раёнах ЛКСМБ быў адным з галоўных у справе ўбрання памяшканняў і вёсак адпаведнымі лозунгамі, арганізацыі спектакляў і г.д. У большасці раёнаў камсамольцы ініцыявалі выпуск і актыўна дапамагалі рыхтаваць спецыялізаваныя насценныя газеты. Уся гэта падрыхтоўчая праца не адрывалася ад гаспадарча-палітычных кампаній і большасцю ячэяк ЛКСМБ цесна звязвалася з далейшай калектывізацыяй сельскай гаспадаркі, умацаваннем існуючых калгасаў, выкананнем плану нарыхтовак, мабілізацыяй сродкаў насельніцтва і г.д. [56, л. 109, 111].

Нягледзячы на такую гіперактыўнасць, шэраг РК саюза не сістэматычна і кампанейскі правялі працу з бядняцка-батрацкай моладдзю, у выніку чаго сарваліся яе канферэнцыі па пытанні перавыбараў саветаў. Шэраг сходаў моладзі прайшлі без належнага кіраўніцтва з боку камсамольскіх ячэяк. Некаторыя ячэйкі ЛКСМБ недаацанілі палітычную сутнасць перавыбараў саветаў і не ўцягнуліся ў актыўную працу па правядзенні гэтай кампаніі, а шэраг ячэяк увогуле бяздзейнічаў. Многія РК камсамола не ўключыліся ў савецкую эстафету, не мабілізавалі грамадскай думкі вакол гэтага пытання. У многіх месцах камсамольцы выступалі супраць кандыдатур, вылучаных партыйнымі і камсамольскімі ячэйкамі, або

супраць сваёй жа кандыдатуры. З боку многіх РК і ячэяк ЛКСМБ меліся факты несур’ёзных адносін да вылучэння кандыдатур у саветы, з-за чаго шмат камсамольцаў правaліліся, бо не мелі аўтарытэту сярод працоўнага насельніцтва [56, л. 114–116]. У выніку, працэнт камсамольцаў у саветах значна знізіўся і камсамольская мабілізацыя на савецкую працу была сарвана [68, л. 41–42]. Як бачым, у камсамоле БССР так і не была адладжана сістэма ўдзелу ў перавыбарах саветаў, захоўвалася апазіцыя палітыцы кампартыі, таму ўплыў камсамола ў саветах працягваў скарачацца.

Разам з тым, выразна прасочваецца тэндэнцыя да павелічэння прадстаўніцтва моладзі ў органах улады і кіравання Полаччыны і Віцебшчыны, асабліва ў саветах. Палітыка вылучэння камсамольцаў і моладзі на дзяржаўныя пасады не спынялася напрацягу ўсяго разглядаемага перыяду.

У другой палове 1930-х гадоў удзел моладзі ў працы саветаў і дзяржаўнага апарату пашыраўся, а працэнт ахопа камсамолам маладых дэпутатаў саветаў працягваў скарачацца, хаця камсамольскія арганізацыі Полаччыны і Віцебшчыны дэманстравалі высокую актыўнасць у час выбараў саветаў. Адбываўся рост ролі і ўплыву ЛКСМБ, але гэты працэс ішоў адносна павольна і яўна не паспяваў за тэмпамі прыцягнення моладзі да працы ў саветах. Такое становішча сведчыць як аб значнай грамадскай актыўнасці маладога пакалення Беларусі ў той час, так і аб наяўнасці адпаведнай дзяржаўнай палітыкі па актыўным прыцягненні здольнай моладзі да працы ў органах улады і кіравання незалежна ад яе прыналежнасці да камсамола.

Такім чынам, пачатак 1920-х гг. характарызаваўся значным зніжэннем удзелу маладога пакалення Полаччыны і Віцебшчыны ў грамадска-палітычным жыцці, што тлумачыцца стомленасцю ад бурлівых рэвалюцыйных і ваенных падзей.

Нягледзячы на гэта, удзел моладзі ў грамадскім жыцці не спыніўся. У гэты час ствараліся розныя пераважна апалітычныя гурткі і групы. Але жаданне савецкага кіраўніцтва кантраляваць і накіроўваць грамадскую актыўнасць юнакоў і дзяўчын, што цалкам зразумела, перашкаджала пашырэнню ініцыятыўных грамадскіх маладзёжных аб’яднанняў.

Актыўны ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё маладога пакалення імкнуўся аказваць камсамол праз арганізацыю розных мерапрыемстваў і пашырэнне свайго прадстаўніцтва ў грамадскіх арганізацыях, органах улады і кіравання. Але часта ў саюзе адсутнічала сістэмная арганізацыя працы камсамольцаў у грамадскіх і дзяржаўных структурах, назіраўся фармальны падыход да гэтай справы. Таму павелічэнне колькасных паказчыкаў не заўсёды суправаджалася высокай якасцю працы.

Разам з тым, з пераходам ад палітыкі ваеннага камунізму да новай эканамічнай палітыкі ўнутры кампартыі пачалі ўзрастаць апазіцыйныя настроі, якія пад уплывам старшых таварышаў-партыйцаў распаўсюдзіліся і на камсамольцаў.

Увогуле, асаблівасцю камсамола Савецкай Беларусі ў 20-я – 30-я гг. ХХ ст. з’яўлялася наяўнасць у ім унутранай апазіцыі (прычым як левага, так і правага толку), звязанай з апазіцыянерамі ў кампартыі. Такое становішча дэманструе як наяўнасць і канкурэнцыю сярод камсамольцаў розных поглядаў на дзейнасць саюза, так і фактычна адзіны фронт апазіцыі ўнутры кампартыі і камсамола.

Грамадска-палітычная актыўнасць усіх сацыяльных груп моладзі стала расці толькі з сярэдзіны 1924 г. Таму да канца 1924 г. савецкія ўлады забаранілі ці прымусілі “самараспусціцца” амаль усе маладзёжныя некамуністычныя арганізацыі.

Аднак антыкамуністычны рух у асяроддзі моладзі не спыніўся і нават адзначалася яго ўзмацненне на глебе актыўнасці маладога пакалення, а таксама наяўнасці эканамічных праблем.

Да таго ж у сярэдзіне 1920-х гг. на вёсцы разгарнулася сапраўдная барацьба паміж заможным сялянствам і камсамолам за ўплыў на юнацтва.

У цэлым рост грамадска-палітычнай актыўнасці юнакоў і дзяўчын Полаччыны і Віцебшчыны напрацягу 1920-х гг. быў нестабільны. Ён стабілізаваўся толькі ў 1930-я гг., калі, дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы, галоўную ролю ў арганізацыі грамадска-палітычнага жыцця маладога пакалення канчаткова замацаваў за сабой камсамол. Пры гэтым толькі ў другой палове 1930-х гг. значна выраслі як удзельны вес ЛКСМБ у грамадска-палітычным жыцці не толькі гарадоў, але і вёскі, так і палітычны ўзровень моладзі.

У працы па палітасвеце юнакоў і дзяўчын кампартыя абапіралася на камсамольскія структуры. У справе арганізацыі палітасветы моладзі можна выдзяліць тры перыяды: 1921–1928 гг. – этап складанага, але паступальнага развіцця; 1929–1935 гг. – фактычны заняпад маладзёжнай палітасветпрацы; 1936–1939 гг. – час арганізацыйнага аднаўлення і далейшага развіцця палітасветы маладога пакалення.

Росту палітычнай актыўнасці юнакоў і дзяўчын спрыялі кампаніі сацыялістычнага будаўніцтва. Масавы характар сярод працоўнай моладзі атрымала барацьба з ухіламі ад лініі кампартыі і класавымі ворагамі, імкненне да ўступлення ў камсамол. Гэта сведчыць аб несумненным поспеху савецкай улады ў падпарадкаванні маладога пакалення свайму ўплыву.

Аднак у асяроддзі юнацтва існавала і незадаволенасць прывілеяваным становішчам камуністаў і камсамольцаў. Асабліва антысавецкія настроі былі распаўсюджаны сярод студэнцтва.

ЛІТАРАТУРА

1. Красная смена. – 1922. – 14 апреля.
2. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (далей – РДАСПГ). – Ф. М-1. Воп. 23. Спр. 32.
3. Ляхоўскі, У. Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1939 г. / У. Ляхоўскі. – Беласток : Беларускае гіст. таварыства ; Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2012. – 483 с.
4. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 246. Воп. 5. Спр. 3.
5. РДАСПГ. – Ф. М-32. Воп. 1. Спр. 40.
6. РДАСПГ. – Ф. М-32. Воп. 1. Спр. 47.
7. РДАСПГ. – Ф. М-32. Воп. 1. Спр. 76.
8. РДАСПГ. – Ф. М-32. Воп. 1. Спр. 88.
9. РДАСПГ. – Ф. М-32. Воп. 1. Спр. 89.
10. РДАСПГ. – Ф. М-32. Воп. 1. Спр. 90.
11. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 23.
12. Замойскі, А. Стасункі паміж жыхарамі мястэчак Беларусі і савецкай уладай у 1918–1928 гг. / А. Замойскі // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2008 – № 29. – S. 91–114.
13. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 86.
14. РДАСПГ. – Ф. М-1. Воп. 23. Спр. 68.
15. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 21. Спр. 23.
16. РДАСПГ. – Ф. М-32. Воп. 1. Спр. 30.
17. Резолюции Всероссийск. учредительн. конф. : программа и устав Е.С.С.Р.М. “Югенд Поалей-цион”. – М. : 20-я государственная типография, 1921. – 31 с.
18. Журов, А. Под руководством партии. Деятельность КПБ по созданию и руководству комсомолом Белоруссии (1918–1925 гг.) / А. Журов. – Минск : Беларусь, 1970. – 216 с.
19. Гесь, А. Цэнтральнае бюро пралетарскага студэнцтва / А. Гесь // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск : БелЭн, 2003. – Т. 6., Кн. 2. – С. 117.
20. Бюллетень официальных распоряжений и сообщений Витебского губернского политико-просветительного комитета. – 1921. – № 5.
21. РДАСПГ. – Ф. М-1. Воп. 23. Спр. 171.
22. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 23.
23. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 37.
24. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 32.
25. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 60.
26. Звезда. – 1925. – 4 февр.
27. Шубин, А.В. Вожди и заговорщики / А.В. Шубин. – М. : Вече, 2004. – 400 с.
28. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 179.
29. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 307.
30. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 398.
31. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 499.
32. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 66.
33. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 69.
34. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 358.
35. НАРБ. – Ф. 312. Воп. 1. Спр. 89.
36. НАРБ. – Ф. 291. Воп. 1. Спр. 420.
37. Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии / ред. кол.: А.Е. Журов [и др.]. – Минск : Беларусь, 1975. – 536 с.
38. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 465.
39. Советская деревня глазами ВЧК – ОГПУ – НКВД. 1918 – 1939. Документы и материалы / под ред. А. Береловича, В. Данилова. – М. : РОССПЭН, 2000. – Т. 2. : 1923 – 1929 гг. – 1168 с.
40. Шубин, А. 1937. Антитеррор Сталина / А. Шубин. – М. : Яуза, Эксмо, 2010. – 352 с.
41. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 99.
42. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 100.
43. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 108.
44. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 477.
45. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 539.
46. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 544.
47. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 677.
48. РДАСПГ. Ф. М-1. Воп. 23. Спр. 969.

Polotsk SU

49. Ударны квартал 5-цігодкі – палітычны экзамен камсамолу. Да ўсёй камсамольскай арганізацыі Беларусі // Чырвоная зьмена. – 1930. – 13 кастр.
50. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 101.
51. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 554.
52. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 295.
53. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 112.
54. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 131.
55. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 572.
56. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 120.
57. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 122.
58. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 126.
59. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 134.
60. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 135.
61. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 591.
62. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 621.
63. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 2. Спр. 627.
64. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 24.
65. Жукович, Г.С. Участие комсомола в государственном управлении / Г.С. Жукович. – Минск : Наука и техника, 1969. – 116 с.
66. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 73.
67. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 105.
68. НАРБ. – Ф. 63п. Воп. 1. Спр. 128.

## THE YOUTH OF POLOTSK AND VITEBSK REGION IN THE SOCIO-POLITICAL LIFE OF THE SOVIET BELARUS IN 1921–1939

***V. DANILOVICH***

*The article investigates the problems of youth participation in social and political life of Vitebsk Polotchiny and 20 – 30-ies. the XX century. It is alleged that the beginning of the 1920s. characterized by a significant decrease in the younger generation to participate in public and political life of the region. The political activity of all social groups of young people began to grow only from middle 1924. By the end of 1924 the Soviet authorities banned or forced to «dissolve itself» almost all the non-Communist youth organization. For a long time the majority of the youth and even the Komsomol region lacking political literacy. Only in the second half of the 1930s. increased significantly as a proportion of the Komsomol in political life and political level of the younger generation. This feature of the Komsomol of Soviet Belarus in the 20s – 30s. the XX century is the presence of internal opposition (both left and right-wing), associated with the opposition in the Communist Party.*

PolotskSU